СУСТРЭЧЫ

# МАРАФОН ПАЭТЭСЫ ПРАЦЯГВАЕЦЦА Ў СТАЛІЦЫ

**МІНСК. Наша калега па абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Таццяна ЯЦУК днямі выступіла ў сталіцы. Аўдыторыю творцы склалі вядучыя бібліятэкары з усёй рэспублікі.**



25 чэрвеня адбылася сустрэча члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэсы-педагога Таццяны Мікалаеўны Яцук са слухачамі курсаў павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры, дырэктарамі і супрацоўнікамі бібліятэк краіны. Сустрэча праходзіла на базе бібліятэкі № 10 г. Мінска.

Таццяна Мікалаеўна прэзентавала сваю паэзію. Падчас мерапрыемства, якое прайшло на адным дыханні, гаварылі пра асноўныя тэмы творчасці паэткі. Гучалі вершы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, гістарычнай памяці, вобразу Радзімы, матыву кахання, тэме філасофскага асэнсавання жыцця. Дэманстраваліся відэазапісы і песні на словы госці.

Сустрэча з сучасным паэтычным словам і яго аўтарам літаральна захапіла прысутных сваёй шчырасцю, прыгажосцю і мудрасцю душы беларускай жанчыны-творцы, а таксама глыбінёй і вострай актуальнасцю закранутых пытанняў.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** член СПБ, паэтэса Таццяна Яцук на творчай сустрэчы са слухачамі курсаў павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры, дырэктарамі і супрацоўнікамі бібліятэк краіны. Мінск, бібліятэка № 10. 25 чэрвеня 2026 года.






Алфавітная музыка слоў
АЛФАВІТНАЯ МУЗЫКА СЛОЎ
АЛФАВІТНАЯ МУЗЫКА СЛОЎ
Зоркі ў прыродзе
Адам Міцкевіч




ТАЦЦЯНА
ЯЦУК
МУДРАСЦЬ
ВЕЧАРА




ЯЦУК
МУДРАСЦЬ
ВЕЧАРА





ДЕТСКАЯ БИБЛИОТЕКА-ФИЛИАЛ №10
г. МИНСК

www.pisateli.by